Лугакоў М.Ф.,к.ф.-м.н.,дацэнт
Неманава І.Ц.,к.ф.-м.н.,дацэнт

# ВОПЫТ ВЫКЛАДАННЯ ФІЗІКІ У БАТУ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ.

Як вядома,выкладанне асобных дысцыплін на беларускай мове пачалося ў БАТУ ў 1993-1994-ым навучальным годзе.У той час па выніках апытання студэнтаў на першым курсе факультэта механізацыі была створана беларускамоўная плынь.У ліку кафедр,якія першымі ўключыліся ў выкладанне па-беларуску,была кафедра фізікі,дзе падрыхтоўка да гэтага праводзілася загадзя.Да пачатку навучальнага года былі падрыхтаваны да друку лекцыі па першай частцы фізікі,выдадзены метадычныя ўказанні,якія ахопліваюць лабараторны практыкум першага семестра.Акрамя гэтага, былі састаўлены і ўведзены ў вучэбны працэс праграмы для ПЭВМ,кантралірую чыя падрыхтоўку студэнтаў да выканання лабараторных работ.

Практычныя і лабараторныя заняткі ў беларускамоўных групах праводзілі,акрамя лектара,у асноўным,двое выкладчыкаў.Відавочна,што падрыхтоўка да заняткаў,асабліва да лекцый,патрабуе пэўных намаганняў і абцяжарваецца адсутнасцю зацверджанай тэрміналогіі,адсутнасцю падручнікаў.Пры падрыхтоўцы і правядзенні заняткаў выкарыстоўваюцца "Зборнік задач па курсе агульнай фізікі","Курс агульнай фізікі.Механіка" (Мінск,Вышэйшая школа,1993,выйшлі з друку ў 1994 годзе).Абодва выданні па праланове кафедры фізікі былі набыты бібліятэкай БАТУ ў дастатковай колькасці.

У цяперашні час на ротапрынце выдадзена 10 метадычных указанняў, якія ахопліваюць 22 лабараторныя работы,што выконваюцца студэнтамі на першым курсе; у друку знаходзяцца яшчэ тры,дзве рыхтуюцца да друку.Такім чынам,да канца бягучага семестра лабараторны практыкум па фізіцы будзе цалкам ахоплены метадычнай літаратурай на беларускай мове.

Працягваецца таксама падрыхтоўка кантралюючых праграм для ПЭВМ па трэцяй частцы курса фізікі.

Вопыт выкладання фізікі на беларускай мове дазваляе зрабіць выснову,што пры наяўнасці адпаведнай вучэбнай і метадычнай літаратуры беларуская мова навучання не стварае для студэнтаў дадатковых цяжкасцей.Вельмі значна,каб у групах беларускамоўнай плыні практычныя і лабараторныя заняткі таксама праводзіліся па-беларуску.